УДК 001:94(476)

# СЦЯПАН СЯМЁНАВІЧ КУТОРГА – ГЕОЛАГ І ПАПУЛЯРЫЗАТАР НАВУКІ

***Хаданёнак А.А., загадчык архіва, Хаданёнак В.М., к.г.н.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*
*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разглядаецца няпросты жыццёвы шлях і творчыя дасягненні выбітнага беларускага вучонага Сцяпана Сямёнавіча Куторгі. Паказаны яго ўплыў на развіццё геалогіі і папулярызацыю навуковых ведаў у грамадстве.*

Ключавыя словы: геалогія, заалогія, мінералогія, палеанталогія, геалагічныя і геагнастычныя карты, петраграфія, геахімія, палеагляцыялогія, глебазнаўства, краязнаўства, гісторыя навукі.

Геаграфія – адна з найбольш старажытных навук. Дакладныя геаграфічныя звесткі адносяцца ўжо да IV–III тыс. да н. э. (старажытныя карты, планы, звесткі аб падарожжах па Вавілоніі, Кітаю і Егіпце). Фарміраванне капітылістычных адносін патрабавала дакладных ведаў пра гандлёвыя шляхі, пра прыродныя умовы адкрытых земляў. У еўрапейскіх краінах пачаўся працэс назапашвання геаграфічных ведаў. Пад уплывам механістычнай карціны свету і новых метдалагічных падыходаў, закладзеных Ф. Бэканам, Р. Дэкартам, была напісана работа Б. Варэнія “Усеагульная геаграфія”.

У XIX ст. афармляецца храналагічная і генетычная канцэпцыі, асновы вучэння аб геаграфічнай абалонцы і эканамічным раянаванні, распрацоўка пачаткаў ландшафтазнання. Геаграфія Новага часу – гэта ў першую чаргу ідэі К. Рытэра, А. Гумбальдта, адкрыцці Ф. Нансэна, Д. Кука, Д. Левінгстона і інш.

Карпатлівай і штодзённай упартай працы патрабавала ад сваіх прыхільнікаў геалогія. І хоць імёны выбітных даследчыкаў у гэтай галіне навукі не такія папулярныя сёння, чалавецтва з удзячнасцю ўзгадвае Аманца Грэслі і Родэрыка Мурчысана, Чарльза Лайела, Роберта Классана і многіх іншых, без якіх нашы веды пра склад і гісторыю зямной кары і карысныя выкапні былі б далёка не поўнымі.

Не засталіся ў баку ад геаграфічных адкрыццяў і геалагічных вынаходніцтваў ураджэнцы беларускіх земляў. Іх імёнамі названы рэкі і мысы, балоты і цэлыя астравы, мінералы і вулканічныя ланцугі гор, астранамічныя аб’екты. У кожнага з іх быў свой пакручасты лёс і лінія жыцця. Адным з такіх вучоных з’яўляецца С. С. Куторга.

Сцяпан Сямёнавіч Куторга нарадзіўся 24 лютага 1805 г. у горадзе Мсціслаўль у небагатай сям’і службоўца [1, с. 249]. Пачатковую адукацыю атрымаў дома пад кіраўніцтвам свайго бацькі. У 1813 г. сям’я Куторгаў пераязджае ў Пецярбург [2, с. 3]. З 1818 г. С. С. Куторга ў якасці вольнага слухача наведваў Пецярбургскую губернскую гімназію. Затым атрымліваў адукацыю ў Настаўніцкім інстытуце. Там ён увайшоў у склад 30 студэнтаў, якія вучыліся за казённы кошт.

У студзені 1827 г. Сцяпан Сямёнавіч паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Санкт-Пецярбургскага ўніверсітэта, з якога затым быў пераведзены ў Дэрпцкі ўніверсітэт. Там ён навучаўся на медыцынскім факультэце, дзе грунтоўна вывучаў анатомію і фізіялогію і ў 1832 г. атрымаў ступень доктара медыцыны за работу “De organis voces et loquelae psittaci erytaci”. Яна была прысвечана асаблівасцям органаў, якія ўдзельнічаюць у працэсе голасаўтварэння ў шэрых папугаяў.

У 1832–1833 гг. С. Куторга разам з прафесарам заалогіі Дэрпцкага ўніверсітэта М. Г. Ратке, здзейсніў 6-месячнае падарожжа па Крыму. Пад час яго з нумулітавых вапнякоў у наваколлі Сімферопаля былі вывучаны парэшткі марскога вожыка, адзіночны шасціпрамянёвы карал, некалькі відаў нумулітаў, два віды двухстворкавых малюскаў і адзін від бруханогага малюска.

Негледзячы на тое, што амаль усё жыццё С. С. Куторгі прайшло ў Дэрпце і Санкт-Пецярбургу, ён разам з братам-гісторыкам, прафесарам Пецярбургскага ўніверсітэта Міхаілам Сямёнавічам, штогод, пад час летніх канікулаў прыязджаў на Радзіму, дзе вёў асветніцкую дзейнасць сярод мясцовага насельніцтва. З восені 1833 г. Сцяпан Сямёнавіч на працягу 28 гадоў узначальваў кафедру заалогіі ў Пецярбургскім універсітэце. У 1835 г. атрымаў званне прафесара заалогіі, а ў 1837 г. – ардынарнага прафесара. Ён валодаў надзвычайным красамоўствам і з-за адсутнасці дастатковай колькасці прафесараў

вымушаны быў чытаць лекцыі па заалогіі, анатоміі, палеанталогіі і шмат якіх вузкаспецыяльных курсах. Яго лекцыі наведвалі Дз. І. Мендзялееў і К. А. Ціміразеў.

С. Кутарга стаў адным з першых і лепшых папулярызатараў натуральна-гістарычных ведаў; яго артыкулы ў “Бібліятэцы для чытання” і “Часопісе міністэрства народнага асветы” знаёмілі чытачоў з многімі актуальнымі пытаннямі прыродазнаўчых навук. Ён першы ў Расійскай імперыі пазнаёміў студэнтаў з эвалюцыйным вучэннем Чарльза Роберта Дарвіна. Многія з яго вучняў потым сталі вядомымі і паспяховымі вучонымі-натуралістамі. Сярод іх асабліва вылучаюцца Карл Фёдаравіч Кеслер і Леў Сямёнавіч Цанкоўскі.

У 1835 г. Сцяпан Сямёнавіч быў прызначаны цэнзарам Пецярбургскага цэнзурнага камітэта пры Міністэрстве народнай асветы. Шматлікія навуковыя і мастацкія работы былі ім асабіста падпісаны для выхаду ў свет. Сярод іх можна згадаць кнігі Дз. І. Сакалова “Курс геогнозии” і “Руководство к геогнозии”, а таксама вершы М. Ю. Лермантава. За свой даволі ліберальны падыход да цэнзуравання работ, Сцяпан Сямёнавіч быў некалькі разоў пад пагрозай звальнення з універсітэта, праз незадаволенасць старшыні асобага камітэта па нагляду за друкам Дз. П. Бутурліна.

У 1839 г. пабачыла свет фундаментальная манаграфія С. С. Куторгі “Естественная история наливочных животных”. Яна была прысвечана мікраарганізмам і базавалася на ўласных даследаваннях і высновах заснавальніка мікрапалеанталогіі нямецкага вучонага Х. Г. Эрэнберга.

У 1842 г. Куторга С. С. быў абраны старшынёй Пецярбургскага мінералагічнага таварыства, якім заставаўся да самай смерці. Ён заснаваў навукова перыядычны часопіс Мінералагічнага таварыства “Записки Санкт-Петербургского Российского императорского минералогического общества”, які выдаваўся спачатку на нямецкай мове пад назвай “Verhandlungen der Russisch-Kaiserlichen Mineralogischen Gesellschaft zu”.

С. Куторга склаў падрабязную геалагічную карту Пецярбургскай губерні, за што быў уганараваны надзвычай прэстыжнай Дзямідаўскай прэміяй. З 1848 г. Сцяпан Сямёнавіч выкладаў мінералогію і геалогію ў Галоўным педагагічным інстытуце да яго закрыцця ў 1859 г.

Вялікім поспехам у самага шырокага кола чытачоў карысталася кніга С. Куторгі “Гісторыя зямной кары”. 17 сакавіка 1853 г. Савет Імператарскага Рускага Геаграфічнага таварыства прысудзіў яму за працу “10-вёрстная геагнастычная карта Пецярбургскай губерніі” сваю вышэйшую ўзнагароду, тады яшчэ адзіную, – залаты Канстанцінаўскі медаль. У 1856 г. Куторга С. С. атрымаў цывільны чын IV класа Табелі аб рангах Расійскай імперыі – Праўдзейнага стацкага саветніка. Гэты высокі чын адпавядаў пасадзе дырэктара дэпартамента, губернатара і граданачальніка і даваў правы на спадчыннае дваранства.

Навуковая друкаваная спадчына Сцяпан Сямёныча складае звыш за 40 работ, якія былі прысвечаны самым разнастайным галінам навукі: агульная геалогія, палеазаалогія, палеабатаніка, мікрапалеанталогія, палеаэкалогія, заалогія, мікрабіялогія, анатомія чалавека, параўнаўчая анатомія, мінералогія, петраграфія, геахімія, палеагляцыялогія, картаграфія, краязнаўства, глебазнаўства, археалогія.

Сярод іх асабліва вылучаюцца: “Scolopendrae morsitantis anatome” (1834 г.), “Einige Worte gegen die Theorie der Stufenweise Enstehungder Organismen” (1839 г.), “Zur Naturgeschichte der Phoca communis”, “Zwei Beobachtungen der Knochenbrüche bei den Heerschnepfen”, “Описание нескольких новых видов окаменелостей из долины Салгира при Симферополе”, “Beiträge zur Geognosie und Paléontologie Dorpats und seiner Umgebungen”, “Beitrag zar Kenntniss der organischen Ueberreste der Kupfersandsteines am Westlichen Abhange des Urals”, “Beiträge zur Palaeontologie Russlands”, “Neues Orthisarten”, “Ueber die Siphonotreten”, “Geogn. Beobachtungen in sudl. Finland”, “Общий взгляд на Таврический полуостров”, “Общий закон появления, существования и исчезновения организмов”, “Химические законы образования, разрушения и преобразования минеральных форм”, “О системе Лафатера и Галля”, “О горных породах Финляндии”, ”Геологический очерк дороги к водопаду Иматры”, “О происхождении камней”, “Геолог-путеводитель по финляндским берегам и островам Ладожского озера и Финского залива”, “Программа геогностической карты Санкт-Петербургской губернии”, “К познанию органических остатков медистых песчаников западного склона Урала” і інш.

Скончыў свой жыццёвы шлях Сцяпан Сямёнавіч Куторга 7 траўня 1861 г. у Санкт-Пецярбургу. Ён быў пахаваны на Смаленскіх праваслаўных могілках. У гонар нашага славутага земляка былі названы розныя выкапнёвыя арганізмы і расліны: 1962-клас галаваногія малюскаў Kutorgoceras, 1861-клас беззамкавых брахіяпод Kutorgina Billings,

1951-клас замкавых брахіяпод Kutorginella, 1895-тып імшанак Polypora kutorgae Stuckenberg, 1840-аддзел папаратнікападобных раслін Cheilanthites kutorgae Fisher de Waldheim, 1855-аддзел голанасенных раслін Araucarites kutorgae Mercklin [3, с. 56] і інш.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Асветнікі зямлі Беларускай: Энцыклапедычны даведнік / Рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн., БелЭн, 2001. – 496 с.
2. Пузыревский, П. А. Краткий очерк жизни и трудов профессора Степана Семеновича Куторги, бывшего директора Императорского Минералогического общества / П. А. Пузыревский // Записки СПб. минералогического общества. – 1867. – Ч. 2.
3. Крымгольц, Г. Я., Крымгольц Н. Г. Имена отечественных геологов в палеонтологических названиях / Российская академия наук; Палеонтологическое общество. – Санкт-Петербург, 2000. – 139 с.



УДК 94(476)«18»


# ВОЕННОСЛУЖАЩИЕ В СТРУКТУРЕ ГУБЕРНСКИХ АКЦИЗНЫХ УПРАВЛЕНИЙ


***Веретило Ю.В., ст. преп.***

*Гродненский государственный университет имени Янки Купалы, г. Гродно, Республика Беларусь*



Реферат. *В статье рассматривается роль военнослужащих в структуре губернских акцизных управлений. Представлена характеристика должностей, которые занимали отставные военные.*



Ключевые слова: откуп, акциз, акцизная система, губернские акцизные управления, военнослужащие.


Реформа косвенного налогообложения, проведенная в Российской империи в 60-е годы XIX века, внесла значительные изменения в систему взимания налога с алкогольных напитков. Существовавшая откупная система была сопряжена с коррупцией во всех ее проявлениях. Взятками при откупах была пронизана вся вертикаль местной власти в городах не было государственного служащего, который бы не получал положенного отчисления деньгами или вином [1]. За счет такого рода расчетов организовать контроль за поступлением доходов от спиртосодержащей продукции на необходимом уровне было невозможно. По мнению правительства вводимая акцизная система призвана была решить ряд задач:

– выстроить систему контроля за производством и продаже спиртосодержащих напитков в соответствие с требованиями государства;

– коренным образом переломить установившиеся при откупах злоупотребления, что позволило бы значительно увеличить доходы бюджета.

Непосредственными реализаторами акцизной системы на местах являлись губернские акцизные управления.

Для успешности становления и развития проведенной реформы налогообложения алкоголя существенное внимание было отведено подбору персонала, который соответствовал бы целям акцизной системы. Честность, порядочность, дисциплинированность и преданность порученному делу стали лозунгом кадровой политики акцизных управлений. Вместе с тем состав государственных служащих Министерства финансов начала 60-х годов XIX века не мог в полной мере обеспечить достаточного числа необходимых чиновников, которые могли бы быть назначены на должности служащих губернских и окружных акцизных управлений [2, с. 168]. Данное обстоятельство послужило толчком к поиску соответствующего контингента среди прочих лиц, одними из которых были военнослужащие.

На должности в акцизных управлениях могли претендовать уволенные в отставку военнослужащие, при этом после назначения они приводились к присяге на верность императору с последующим переименованием военного чина в соответствующий гражданский [3, с. 45]. Анализ источников позволяет утверждать, что значительная часть